## Пачак з цукрам

Надта любіў Васька салодкае. І вось што з ім праз гэта здарылася. Прыйшоў ён са школы, а маці кажа: “Схадзі, сынок, у магазін, цукру прынясі”.

Прасіць на гэта Ваську доўга не трэба. Пабег. Узяў сіні пачак з надпісам “Рафінад” – і дадому. Ціха, не спяшаючася, ідзе. І ўсё пачак круціць у руках. Аглядае: “Тут, здаецца, слабей склеены”. Пацягнуў за ражок. Падаецца. Вось і цукар паказаўся. Вася ўзяў крайні кавалачак. Асалода! Хутка апынуўся ў роце і другі.

А праз некалькі крокаў зноў захацелася Ваську з’есці… ну хоць бы адзін драбок. Выцягнуў. Потым другі, трэці…

Схамянуўся Васіль, калі паўпачка апаражніў. Што рабіць? Хлопчык маланкава стаў корпацца ў кішэнях. Выцягнуў адтуль пакамечаныя лісты паперы, набіў імі пачак, лізнуў адарваны ражок упакоўкі і заклеіў.

Здзівілася маці, што надта лёгкі пачак. Разгарнула і ўскрыкнула ад нечаканасці:

– Авой-авой! Папера. Вось дык цуд…

– На фабрыцы, пэўна, падклалі, – падтрымаў сын.

– Ды ўжо ж, на фабрыцы. А вось і прозвішча дырэктара.

Глянуў хлопчык і аслупянеў: на адным з лістоў быў яго размашысты подпіс: “Лыжкін Васіль”.

***Врабій Павел Вітальевіч,***
вучань VIII класа ДУА «Чурылавіцкая сярэдняя школа»
Мінскага раёна